Аўтар: Рэдакцыя
20.03.2022 00:00

ДОБРАЯ ВЕСТКА Ў ТВАІМ ДОМЕ!
Каталіцкі ВЕСНІК
ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАЙ ДЫЯЦЭЗІІ

Духоўнае вымярэнне чалавека – несмяротная душа, розум і вольная воля – чыніць яго вобразам і падабенствам Бога. Аднак чалавек – гэта яшчэ і цела. Таму яму неабходна заспакойваць і матэрыяльныя патрэбы. Касцёл навучае, што імкненне да дабрабыту з'яўляецца натуральным правам чалавека, а валоданне маёмасцю – неабходнай умовай для яго годнага жыцця.

Пытанне прыватнай уласнасці настолькі важнае, што Бог даў нам асобную запаведзь – "не крадзі". Валоданне дабротамі адпавядае чалавечай натуры і годнасці. Сацыяльнае вучэнне Каталіцкага Касцёла бароніць прыватную ўласнасць як штосьці неабходнае для жыцця і аўтаноміі чалавека. Права на валоданне прыватнай уласнасцю – рэчамі, грашыма, нерухомасцю, інтэлектуальнай маёмасцю – вынікае наўпрост з права чалавека на жыццё, з таго, што ён з'яўляецца асобай, разумнай і вольнай.



Пост, міласціна, малітва – тры ўмовы перажывання Вялікага посту.

На жаль, значэнне слова "пост" стала менш зразумелым у наш час. Пасціць – азначае "адмовіцца ад дабра дзеля чагосьці большага". Да прыкладу, малады чалавек адмаўляецца ад футбольнага матча дзеля спаткання з каханай. Яна ж адмаўляецца ад ежы, каб мець асіную талію.

У сваю чаргу міласціна – гэта не толькі кінуць капейкі жабраку. Гэта мудрая дапамога грашыма, гэта час, прысвечаны іншай асобе, гэта чын любові, добры ўчынак, выкананы ў імя любові да Бога і бліжняга.

Усё, што даецца вельмі цяжка: рашэнні, пост, унутранае змаганне – усё гэта павінна давесці да сустрэчы з Езусам Хрыстом. І няхай цялеснай аскезе, аднаўленню чуйнасці на патрэбы іншага чалавека, паглыбленню любові да Бога і бліжняга і пакаянню спадарожнічае малітва.

Аўтар: Рэдакцыя
20.03.2022 00:00



